**Метадалагічныя і метадычныя аспекты выкладання мовы і**
М 54 **літаратуры ў школе і ВНУ**: зб. навук. арт. / пад рэд. І. У. Таяноўскай, Т. В. Мальцэвіч. – Мн.: БДУ, 2006. – Вып. 5. – 110 с.

***Т. В. Мальцэвіч***

# ФАРМІРАВАННЕ ДЫЯЛАГІЧНЫХ УМЕННЯЎ У ШКОЛЬНЫМ НАВУЧАННІ

Фарміраванне дыялагічных уменняў школьнікаў з’яўляецца важнай педагагічнай задачай. Дыялог – не толькі аснова камунікацыі, але і аснова творчай дзейнасці, гэта спосаб існавання, творчага самавыражэння і пазнання. Сапраўдны дыялог – гэта заўсёды сатворчасць, кааперацыя, супрацоўніцтва. Валоданне дыялагічнымі ўменнямі забяспечвае трывалую аснову для рашэння педагагічнай звышзадачы: "навучанне, выхаванне і развіццё растучага чалавека – гэта магістральныя напрамкі ўсіх звёнаў сістэмы адукацыі" [1, с. 7].

У сучаснай дыдактыцы пашырана інтэрактыўнае навучанне, якое разглядаецца як навучанне ў дыялагічным узаемадзеянні (*inter* – ‘узаемны’, *act* – ‘дзейнічаць’); такая адукацыйная сітуацыя спрыяе развіццю дыялагічных уменняў, неабходных для развіцця і фарміравання моўнай асобы і асобы ў цэлым. Але ўменню будаваць дыялог трэба вучыць, трэба вучыць *тэхніцы* дыялогу, каб яна, трывала засвоеная,ператварылася ў *майстэрства*, што магчыма ажыццяўляць мэтанакіравана на занятках па рыторыцы, а таксама на ўроках па развіцці маўлення, у межах спецкурсаў і курсаў па выбару.

Прафесар В. У. Протчанка падкрэсліваў неабходнасць забеспячэння прадуктыўнага характару маўленчай камунікацыі [2, с. 90], і сярод важнейшых дыялагічных уменняў неабходна фарміраваць і развіваць у школьнікаў, на наш погляд, наступныя:

§ аналізаваць камунікатыўную сітуацыю (знешнія і ўнутраныя ўмовы камунікацыі, камунікатыўную ўстаноўку, ролевую ўстаноўку: пастаянную – у выпадку сацыяльнай ролі – і афіцыйную – у выпадку дзелавой ролі);

§ усведамляць камунікатыўную пазіцыю, сваё "я" (аўтар выказвання, слухач, інтэрпрэтатар, крытык, апанент, аднадумца і інш.);

§ прагназіраваць развіццё камунікатыўнай сітуацыі (стратэгічнае і тактычнае планаванне);

§ трымацца маўленчага этыкету;

§ быць ветлівым камунікантам (дэманстраваць увагу і павагу да суразмоўцы, зацікаўленасць);

§ улічваць узровень успрымання камуніканта, яго інтарэсы, матывы і інш. (настройка на камуніканта);

§ прытрымлівацца прынцыпаў бесканфліктнай камунікацыі;

§ фармуліраваць і задаваць пытанні;

§ адказваць на пытанні, у тым ліку правакацыйныя і прагматычна некарэктныя;

§ выражаць свае адносіны да пазіцыі суразмоўцы ў форме згоды, пярэчання, сумнення і інш.;

§ аргументаваць сваю пазіцыю (знаходзіць аргументы, дастатковыя для абаснавання тэзіса, размяшчаць іх у адпаведным парадку, улічваць правілы дэманстрацыі);

§ будаваць і афармляць выказванні, якія адпавядаюць пэўным мадэлям маўленчых дзеянняў (дапушчэнне, сцвярджэнне, перакананне, абвяржэнне, абаснаванне, аргументацыя, ацэнка, выснова і інш.), валодаць этыкетна-маўленчымі формуламі, суадноснымі з дадзенымі дзеяннямі;

§ слухаць суразмоўцу (аналізаваць змест выказвання; бачыць адрозненні ў інфармацыі, атрыманай з іншых крыніц; адрозніваць сапраўдныя і несапраўдныя выказванні; размяжоўваць матывы суразмоўцы ад зместу выказвання; чытаць невербальную інфармацыю (жэсты, міміку, позу, інтанацыю) і інш.);

§ ацэньваць дарэчнасць і недарэчнасць камунікатыўных дзеянняў у сітуацыі дыялога;

§ абагульняць інфармацыю і падводзіць вынікі абмеркаванню.

Як бачым, большасць з прыведзеных уменняў мае сінтэтычную прыроду: для іх фарміравання неабходны веды па псіхалогіі, псіхалінгвістыцы, логіцы, этыцы і інш. Менавіта такой сінкрэтычнай прыродай характарызуецца рыторыка – навука аб эфектыўнай камунікацыі. Падкрэслім, што навучанне рыторыцы – гэта фарміраванне не асобных уменняў і навыкаў, а сістэмы цэласных аперацыянальных комплексаў. Так, усе прыведзеныя вышэй уменні можна аб’яднаць у адзіны аперацыянальны комплекс – тактыка-стратэгічнае планаванне і рэалізацыя камунікатыўнага плана у дыялогу (яго відах). Акрэсленыя уменні функцыяніруюць у дыялогу не асобна, а як сінергетычная сістэма; таму недахопы, памылкі ў адным са звёнаў сістэмы непазбежна адлюструюцца на паспяховасці камунікатыўнага ўзаемадзеяння ў цэлым.

Некаторыя з дадзеных уменняў можна адпрацоўваць асобна (і дарэчы, эфектыўна) з дапамогай практыкаванняў, або камунікатыўных задач, але звязаць іх у адзіны аперацыянальны комплекс, валоданне якім дазволіць камуніканту падняцца на якасна новы ўзровень дыялагічнага узаемадзеяння, магчыма у асяроддзі самой маўленчай сітуацыі. Навучанне камунікатыўнай дзейнасці – гэта *навучанне ў дзеянні праз саму дзейнасць*. Напрыклад, дыскусія, круглы стол, прэс-канферэнцыя, інтэрв’ю, аналіз уласнай і чужой камунікатыўнай дзейнасці выкарыстоўваюцца, з аднаго боку, як формы навучання (зместам у данным выпадку могуць быць веды па рыторыцы і іншым гуманітарным дысцыплінам), з другога боку, планаванне і ажыццяўленне дадзеных камунікатыўных актаў і падзей на аснове сфарміраваных аперацыянальных комплексаў з’яўляецца звышзадачай, вынікам заняткаў па рыторыцы і развіццю звязнага маўлення.

У фарміраванні і развіцці дыялагічных уменняў эфектыўнымі з’яўляюцца наступныя актыўныя метады і формы навучання:

§ Метад **ролевай гульні**, які рэалізуецца ў шматлікіх формах: стварэнне стэрэатыпных камунікатыўных сітуацый з розна- або адноўзроўневым становішчам камунікантаў (начальнік – падначалены, бацькі – дзеці, настаўнік – вучань, сэрвісны работнік – спажывец, чыноўнік – юрыдычная асоба, чыноўнік – фізічная асоба і г. д.); прэс-канферэнцыі з удзелам апанентаў, дылетантаў, аднадумцаў (зместам з’яўляецца матэрыял вывучанай тэмы), інтэрв’ю. Цікавым для вучняў відам ролевай гульні з’яўляецца *дзелавая гульня* у наступных формах: тэлефонныя і візуальныя перамовы; прэзентацыі (фізічнай асобы, юрыдычная асобы, самапрэзентацыі); розныя віды размовы (з калегамі і партнёрамі, кліентамі, канкурэнтамі. У цэнтры ўвагі тут канструктыўныя стылі дзелавой камунікацыі і камунікатыўныя прыёмы, прынцыповыя па сутнасці і прынцыповыя па форме. Адзначым, што пры правядзенні ролевай гульні неабходна аналізаваць з вучнямі наступныя *значымыя кампаненты камунікатыўнай сітуацыі*: а) камунікатыўную ўстаноўку, б) ролевую ўстаноўку, в) дарэчнасць тых або іншых камунікатыўна-маўленчых формул [3, с. 179–183].

§ Метад **калектыўнага абмеркавання** і яго формы: круглы стол (мэта – выпрацоўка новых пагадненняў), "мазгавы" штурм (мэта – выпрацоўка новых ідэй), каманднае абмеркаванне (замацаванне тэзісаў каманд-удзельніц).

§ Метад рашэння **камунікатыўных задач**球 рознага ўзроўню складанасці: тэкставыя заданні (дапоўніць, прадоўжыць, аднавіць, стварыць тэкст, складанне дэнатэтнага графа і інш.); задачы, звязаныя з выпрацоўкай стратэгіі і тактыкі паводзін ў акрэсленай камунікатыўнай сітуацыі (дадзена апісанне сітуацыі, вызначана мэта камуніканта, неабходна паказаць шляхі, спосабы і сродкі яе дасягнення); заданні, звязаныя з удасканальваннем аргументацыйных уменняў і інш.

§ Метад **аналіза камунікатыўнай дзейнасці** (у тым ліку і ўласнай) з дапамогай аудыё- і відэаматэрыялаў. Можна выкарыстаць наступны план комплекснага камунікатыўнага аналізу (паводле Ч. Далецкага) [4, с. 299]:

1. Мэта камунікацыі.
2. Тып камунікацыі.
3. Моўны пашпарт камунікантаў.
4. Выкананне правіл этыкету.
5. Роля ўдзельнікаў камунікацыі.
6. Маўленчыя гульні.
7. Ускосныя маўленчыя акты.

Выкананне камунікатыўных задач (практыкаванняў), тэставых заданняў, правядзенне гульні ў сучаснай дыдактыцы ўсё часцей называецца трэнінгам. *Камунікатыўныя трэнінгі* звычайна праводзяцца у малых групах з мэтай замацавання тэарэтычных звестак і фарміравання неабходных для дыялагічнага ўзаемадзеяння мысліцельных і маўленчых уменняў. Абавязковая ўмова трэнінгаў – праца ў калектыве. Згадаем вядомую прытчу Б. Шоу: калі ў

вас ёсць яблык, і ў мяне ёсць яблык, і мы абмяняемся імі, то ў кожнага з нас застанецца па яблыку; калі ж мы абмяняемся ідэямі, то ў кожнага будзе па дзве ідэі.

Асновай маўленчага дзеяння на уроку з'яўляецца стымуляцыя маўленчай сітуацыі. Адзін з дзейсных спосабаў навучання – стварэнне ўмоў, якія не супярэчаць, а адпавядаюць запатрабаванням школьніка. Вельмі важна пры арганізацыі навучальнага працэсу, па-першае, паклапаціцца аб матывацыі камунікатыўнай дзейнасці школьнікаў, па-другое, фарміраваць у вучня станоўчае адчуванне сваёй асобы, г. зн. падтрымліваць яго *пачуццё самакаштоўнасці* (тэрмін В. Сацір [паводле Ю. Б. Гіппенрэйтар – 5, с. 188]), па-трэцяе, стварыць станоўчую эмацыянальную атмасферу на ўроку, у тым ліку пры аналізе памылак, бо "памылка" – гэта крок на шляху да поспеху.

### *Літаратура*


1. *Протчанка, В. У.* Рэфармаванне адукацыі і мова / В. У. Протчанка // Беларус. мова і літ. – 1997. – № 8.
2. *Протчанка, В. У.* Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В. У. Протчанка. – Мн., 2001.
3. Русский язык и культура речи: учеб. / под ред. проф. В. И. Максимова. – 2-е изд., стереотипное. – М., 2004.
4. *Далецкий, Ч.* Риторика: заговори, и я скажу, кто ты: учеб. пособие / Ч. Далецкий. – М., 2003.
5. *Гиппенрейтер, Ю. Б.* Общаться с ребенком. Как? / Ю. Б. Гиппенрейтер. – М., 2004.